УДК 947.6

# ПАЗАКУЛЬТАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ РЭЛІГІЙНЫХ АБШЧЫН НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ БССР У 1930-я гг.

**І. А. Пушкін**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання

*Даследаваны наступныя формы пазакультавай дзейнасці рэлігійных супольнасцей нацыянальных меншасцей БССР: місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям'і, захаванне прынцыпаў і асноў жыцця, кіраванне і дзейнасць рэлігійных арганізацый, асветніцкая, адукацыйная. У выніку аналізу вызначаны прычыны актывізацыі рэлігійнай дзейнасці супольнасцей і асобных вернікаў у 1930-я гг.*

**Ключавыя словы:** рэлігійныя меншасці, царква, канфесіі, рэпрэсіі.

## Уводзіны

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў асноўным асвятляецца рэпрэсіўная палітыка дзяржаўных і карных органаў у адносінах да царквы ў 1930-я гг. [1] і недастаткова раскрыты формы і метады пазакультавай дзейнасці рэлігійных абшчын. Даследуючы іх, неабходна мець на ўвазе, што ў выніку правядзення калектывізацыі і барацьбы з "унутранымі ворагамі" і "агентамі замежных дзяржаў" найбольш працаздольная і актыўная частка насельніцтва была рэпрасавана або дэпартавана за межы БССР. У першую чаргу гэта тычыцца прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, у большай меры – латышоў, літоўцаў, немцаў, палякаў, у меншай – рускіх, яўрэяў і іншых. Але нават тыя, што засталіся, імкнуліся захаваць свае нацыянальныя асаблівасці. Яны ва ўмовах рэпрэсій выкарыстоўвалі ўсе магчымасці па захаванні і забеспячэнні рэлігійных патрэб насельніцтва.

Прадметам нашага даследавання сталі наступныя формы пазакультавай дзейнасці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей БССР: захаванне прынцыпаў і правілаў жыцця, дзейнасць рэлігійных арганізацый, місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям'і, асветная, адукацыйная. У выніку аналізу вызначаны прычыны актывізацыі рэлігійнай дзейнасці абшчын і асобных веруючых.

## Асноўная частка

Трэба падкрэсліць, што веруючыя не выступалі ў якасці пасіўных сведкаў падзей, якія адбываліся па ініцыятыве савецкай улады. Узмоцненая абмежавальна-рэпрэсіўная палітыка, якая праводзілася ў дачыненні да рэлігіі і царквы, выклікала адкрыты і латэнтны супраціў абшчын нацыянальных меншасцей. Рэлігійны актыў з'яўляўся ініцыятарам і арганізатарам супрацьстаяння значнай часткі прадстаўнікоў нацменшасцей афіцыйнаму гвалту ўлады.

На працягу ўсяго перадваеннага дзесяцігоддзя вылучаецца такая форма пазакультавай дзейнасці, як захаванне прынцыпаў і правілаў жыцця. Пачатак 1930-х гг. адзначыўся зняццем званоў з цэркваў і касцёлаў, знікненнем з афіцыйных календароў дзён рэлігійных свят, масавым закрыццём культавых пабудоў. Гэта выклікала абурэнне з боку веруючых, якое часта пераўтваралася ў масавыя стыхійныя выступленні ў Чавусах, Касцюковіцкім раёне і іншых месцах [2, арк. 10, 30].

Правядзенне калектывізацыі парушыла традыцыйны ўклад жыцця нацыянальных меншасцей БССР. Савецкая ўлада бачыла ў калектывізацыі асноўны сродак пераходу да камуністычнага грамадства вясковага насельніцтва, у якім не павінна было быць месца рэлігіі. Аднак у 1930-я гг. значная частка калгаснікаў нацыянальных калгасаў БССР у дні рэлігійных свят, а ў яўрэйскіх і ў суботу, не працавала, стварaлі малельні, рабілі мацу, карысталіся паслугамі рэзніка. Напрыклад, у калгасах "Акцябр" Мазырскага, "Ройтэр Штрал" Крупскага, "Інтэрнацыянал" Капыльскага, "Бальшавік" Чэрвеньскага раёнаў [3, арк. 26; 4, арк. 35; 5, арк. 100].

Калгасны лад быў не сумяшчальны з глыбокай рэлігійнасцю латышскага, нямецкага і польскага насельніцтва Беларусі. Гвалтоўнае правядзенне калектывізацыі ў БССР актывізавала прыхаваную і адрытую пазакультавую дзейнасць веруючых у асяродку нацыянальных меншасцей. Наступныя выказванні і меркаванні – "*Лепш памерці з голаду, таму што там* [у калгасах] *могуць прымусіць ісці супраць рэлігіі… Лепш сядзець пад заборам голым і галодным, але не застацца без рэлігіі*" – былі нярэдкасцю ў Савецкай Беларусі [6, арк. 6].

У латышскіх, літоўскіх, нямецкіх, польскіх і яўрэйскіх сем'ях у 1930-я гг. працягвалі маліцца на роднай мове, чытаць рэлігійныя кнігі. Так, на думку саміх палякаў, рэлігійнасць "*прышчаплялась ім з дзяцінства*" [7, с. 28–29], з'яўляючыся асновай выхавання. Дзеці навучаліся рэлігіі ў касцёле і сям'і. Бацькі штодня маліліся на польскай мове, і дзеці, якія ледзь навучыліся размаўляць, паўтаралі за імі малітвы. Веданне рэлігійных абрадаў было абавязковым для ўсіх членаў польскай сям'і, таму дзеці траплялі ў касцёл значна раней, чым у школу.

Уплыў рэлігіі выразна прасочваецца ва ўсіх сферах жыцця нацыянальных меншасцей. Нават члены КП(б)Б не цураліся рэлігійнай абраднасці. Вядомы выпадкі, калі сакратар ячэйкі КП(б)Б у польскім калгасе хрысціў сваё дзіцяці, у іншым месцы члены кампартыі

© Пушкін І. А., 2016

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прымалі ўдзел у выкананні рэлігійных абрадаў пад час пахавання [8, арк. 19]. У Касцюковіцкім раёне перад яўрэйскай пасхай выпякалі мацу нават члены гарсавета і камсамольцы [5, арк. 100]. Нягледзячы на замену ў савецкім грамадстве рэлігійнага шлюбу на свецкі, большасць палякаў працягвала браць шлюб у касцёлах або таемна выклікаць ксяндза на дом.

У 1930-я гг., нягледзячы на забароны ўладаў, каталіцкі актыў і ксяндзы ў цэлым шэрагу месц узмацнялі працу па стварэнні ў асяродку веруючага польскага насельніцтва грамадскіх арганізацый і кіравалі іх дзейнасцю. Шырока выкарыстоўваліся розныя метады і спосабы місіянерскай і дабрачыннай дзейнасці.

У Полацкай акрузе ксёндз Капуста раз'язджаў па вёсках, дзе жыло польскае насельніцтва. Аднойчы адбыўся цікавы выпадак. Сакратар райкама КП(б)Б накіроўваўся ў вёску і сустрэў ксяндза, які запытаўся куды гэта сакратар едзе. "*А у тую вёску*", – кажа сакратар. Ксёндз у адказ: "*Няма чаго ехаць, бо я ўжо там быў і ўсё, што трэба зрабіў*" [8, арк. 22]. Ксёндз Мустэйкіс у Бабруйскай акрузе арганізаваў грамадскую арганізацыю са спецыяльнымі сяброўскімі білетамі (іх было зроблена каля 3000), складкамі, якія рэгулярна плаціліся, і адзнакі аб гэтым рабіліся ў білетах. Арганізацыя была разгромлена [8, арк. 20]. У Клімавічах (1937 г.) утарылася дабрачынная яўрэйская абшчына. Яе дзейнасць была накіравана на збор сродкаў для дапамогі веруючым бедным яўрэям [9, арк. 55]. На тэрыторыі нацыянальнага польскага Рудня-Насімкаўскага сельсавета Чачэрскага раёна дзейнічалі таварыствы "Тэрцыяраў" і "Ружанца" ("Kołka Różancowa"), праводзіўся збор сродкаў для Гомельскага ксяндза [10, арк. 4].

У 1936 г. старшыня Фашчаўскага сельсавета і дырэктар Фашчаўскай МТС (Шклоўскі раён) запатрабавалі ад мясцовага ксяндза зрабіць капітальны рамонт касцёла: "*предложили ксендзу сделать капитальный ремонт, имея ввиду, что он этого не выполнит и тогда сделаем изъятие костела*" [11, арк. 78–79]. Але вернікі (касцёльная рада) на працягу 2-х дзён сабралі 60 000 рублёў і за 10 дзён адрамантавалі будынак касцёла.

Прыкладам місіянерскай дзейнасці рэлігійных абшчын можа быць інфармацыя па Ушацкім, Бярэзінскім раёнах, дзе да 1937 г. у касцёлах здзяйсняліся рэлігійныя абрады ў тым ліку і для праваслаўных, прычым па больш нізкіх коштах чым гэта рабілі праваслаўныя святары [11, арк. 80].

Пазакультавая дзейнасць прадугледжвала асветную працу сярод моладзі і дзяцей. Так, напрыклад, у Мінску пры касцёле, што быў на могілках, існаваў балетны гурток для дзяцей з адмысловай настаўніцай, у Клімавіцкім раёне равін Брыскер арганізаваў 2 хедэры, адзін на прыватнай кватэры, другі пры сінагозе (у красавіку 1935 г. хедэр наведвалі 10 дзяцей з савецкай яўрэйскай школы). Вучні – дзеці стараабрадцаў, пад уплывам бацькоў, хрысціліся перад і пасля абеду ў школьнай сталоўцы, адмаўляліся слухаць антырэлігійную інфармацыю (Мінкаўская і Пархінская рускія школы Рагачоўскага раёна) [5, арк. 94, 95, 97, 99].

Гуртаванне вакол касцёла жабракоў, раздача грошай дзецям, сувязь з польскім консулам, удзел дзяцей у шэсцях на польскіх могілках, сувязь з польскай савецкай школай, размешчанай каля дома спецыялістаў – уся гэта дзейнасць Мінскага ксяндза савецкай уладаю ў 1937 г. расцэньвалася як "*выключна нахабныя паводзіны*" [11, арк. 81].

Новая хваля актывізацыі пазакультавай дзейнаці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР (1936 г.) і БССР (1937 г.), а таксама правядзеннем Усесаюзнага перапісу насельніцтва, які праводзіўся з 15.10.1936 па 12.01.1937 г.

Дэкларуючы ў асноўным законе краіны (Арт. 124) рэлігійную цярпімасць і свободу, улады не чакалі, што веруючыя розных канфесій выкарыстаюць змест артыкула Канстытуцыі для актывізацыі сваёй дзейнасці. Для параўнання, за 1936 г. былі закрыты па "хадайніцтве працоўных" 81 царква, 22 сінагогі, 9 касцёлаў, усяго 112 храмаў. У той жа час за гэты ж перыяд паступіла ад вернікаў 158 заяў з 51 раёна аб адкрыцці цэркваў, сінагог – 61 заява з 26 раёнаў, касцёлаў – 16 заяў з 11 раёнаў, усяго 235 заяў [12, арк. 90; 9, арк. 80].

На мяжы Бешанковіцкага і Сіроцінскага раёнаў у м. Вулля меўся будынак касцёла, заняты пад склад "Заготзерне". На працягу 1936 г. у Бешанковіцкім раёне сабралі 600 подпісаў за закрыццё касцёла, а ў Сіроцінскім – 1000 подпісаў за адкрыццё [11, арк. 79]. У Чашніках Лепельскага раёна былы равін у 1937 г. падаў заяву ў райвыканкам з просьбай дазволіць яму ўзнавіць сваю ранейшую дзейнасць [13, арк. 145]. У чэрвені 1937 г. у Быхаве З. Фейгін абяцаў даць 8000 руб. на рамонт сінагогі пры ўмовах, што яго падтрымаюць у справе вяртання раней закрытай сінагогі. У Лепелі група іўдзееў падала заяву на пабудову новай сінагогі, а таксама ўзняла пытанне аб вяртанні былой сінагогі, дзе шмат год знаходзіўся масласырзавод [9, арк. 39–40]. У Сенненскім раёне польскім насельніцтвам збіраліся подпісы за адкрыццё касцёла [14, арк. 125].

За тры-чатыры месяцы 1937 г. веруючымі БССР было подана заяў у ЦВК БССР з подпісамі аб: адкрыцці цэркваў – 25 калектыўных заяў, сінагог – 7, касцёлаў – 2, малітоўных дамоў – 1, аб вяртанні канфіскаваных прадметаў культа – 1, рэгістрацыі папоў і ксяндзоў – 5. Улады змаглі за той жа перыяд арганізаваць пада-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чу толькі 13 зваротаў аб закрыцці цэркваў [9, арк. 64]. Асабліва адзначалася актывізацыя веруючых па зборы сродкаў і подпісаў на адкрыццё цэркваў, сінагог і касцёлаў у Шклоўскім, Бягомльскім, Жлобінскім і іншых раёнах падчас Усесаюзнага перапісу насельніцтва [12, арк. 93].

Зафіксаваны шматлікія факты адмаўлення ад удзелу ў перапісу, але адначасова рэлігійны актыў агітаваў, каб людзі запісваліся веруючымі: "*советская власть тогда разрешит возобновить работу ранее закрытых церквей*", "*советской власти из заграницы приказали переписать всех верующих для того, чтобы открыть церкви и костёлы*" [9, арк. 49]. Падобнае было ў Рагачоўскім, Дамонаўскім, Расонскім, Жыткавіцкім, Сенненскім раёнах [6, арк. 3, 16, 218, 275, 289]. У адказ на гэта савецкая ўлада ўзмацніла рэпрэсіўныя дзеянні.

Толькі за тры месяцы 1938 г. былі рэпрасаваныя 6530 чалавек: палякаў – 2663 чал., беларусаў – 2717, украінцаў – 68, рускіх – 61, яўрэяў – 375, немцаў – 152, латышоў – 400, літоўцаў – 56, эстонцаў – 12, іншых нацыянальнасцей – 26. Сярод іх было 7 служыцеляў культу, 778 асоб каталіцкага касцёльнага актыву [15, арк. 2, 4].

Ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбываецца згуртаванне вернікаў на этнічнай аснове. Нягледзячы на рэпрэсіі ў дачыненні да царквы, немцы, палякі, латышы, літоўцы не адракліся ад рэлігіі, яна яшчэ больш кансалідавала іх. Мацнела пазіцыя "*прыняць любыя пакуты за веру*". Сходы вернікаў праходзілі нелегальна, у лесе, з надыходам халадоў – па хатах. Месцы сустрэч змяняліся. Абвесткі ажыццяўлялі жанчыны. Збіраліся вернікі, як правіла, у дамах, дзе гаспадыні-жанчыны, бо мужы былі рэпрэсаваныя [16, с. 236].

У выніку рэпрэсіўных дзеянняў партыйна-савецкага кіраўніцтва БССР у сярэдзіне і другой палове 1930-х гг. рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей засталіся без святароў і рэлігійнага актыву, што дазволіла цалкам забраць культавую маёмасць у дзяржаўную ўласнасць. Застаўшыеся вернікі былі не ў стане абараніць маёмасць абшчын ад супрацьпраўных дзеянняў улад.

**Заключэнне**

Такім чынам, мы можам зрабіць выснову, што, нягледзячы на палітычны і сацыяльны ціск з боку органаў савецкай улады, рэлігійныя абшчыны іўдзейскага, каталіцкага, стараабрадскага і пратэстанцкага веравызнання, якія існавалі ў месцах кампактнага пражывання асоб латышскай, літоўскай, нямецкай, польскай, яўрэйскай і рускай нацыянальнасцей знаходзілі магчымасці для свайго функцыянавання.

Актывізацыя веруючых у 1930-я гг. была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР і БССР, правядзеннем калектывізацыі і Усесаюзнага перапісу насельніцтва (1936–1937 гг.) і справакавала жорсткія рэпрэсіўныя дзеянні ў адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва.

Шэраг нацыянальных меншасцей звязвалі рэлігійныя перакананні з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Ва ўмовах пабудовы савецкай дзяржавы, якая імкнулася да суцэльнага падпарадкавання камуністычнай ідэалогіі і ўсталявання атэістычнага (матэрыялістычнага) светапогляду, рэлігійнае жыццё абшчын у 1930-я гг. стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры нацыянальных меншасцей.

Цалкам ліквідаваць рэлігійныя перакананні ў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей партыйна-савецкаму кіраўніцтву БССР не ўдалося, нягледзячы на сфабрыкаваныя крымінальныя пераслед служыцеляў культаў, знішчэнне культавых будынкаў і прапаганду сацыяльна-эканамічных і культурных дасягненняў у СССР.

***СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ***


1. ***Навіцкі, У.*** Разгром рэлігійных арганізацый / У. Навіцкі // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / А. Вабішэвіч [і інш.] ; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 5. – С. 328–335.
2. Сводки о происшествиях и деятельности милиции и уголовного розыска Могилёвского округа с 8 по 28 января 1930 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМВ). – Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 892.
3. Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138.
4. Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6301.
5. Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852.
6. Дакладныя запіскі РК КП(б)Б. 1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Спр. 12082.
7. ***Трубчик, Е. Г.*** "Этничность" и "костёльность" населения белорусско-польских деревень БССР в межвоенный период / Е. Г. Трубчик // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: Э. С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 27–30.
8. Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б (1930 г.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091.
9. Докладная записка "О состоянии антирелигиозной пропаганды в КП(б)Б и активизации церковников и сектантов в ряде районов БССР" от 07.06.1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12109.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

10. Дакладная запіска аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі ў Чачэрскім раёне. 1931 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5546.
11. Докладная записка “По вопросу о костёлах” от 07.08.1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035.
12. Докладная записка о состоянии антирелигиозной пропаганды в БССР на начало 1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035.
13. Дакладная запіска Лепельскага РК КП(б) Б. 1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852.
14. Дакладная запіска Сенненскага РК КП(б)Б ад 10.05.1937 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852.
15. Статистические сведения репрессированных шпионов, диверсантов и повстанцев польской, литовской и немецкой разведок за 01.06.1938 – 01.09.1938 г. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 14609.
16. ***Пичуков, В.*** От крестьянки-колонистки до спецпереселенки: трагический путь немецкой женщины Советской Беларуси в межвоенный период / В. Пичуков // Репрессивная политика советской власти в Беларуси : сборник науч. работ. Вып. 2 / сост.: И. Кузнецов, Я. Басин ; науч. ред. В. П. Андреев. – Минск, 2007. – С. 209–242.

Паступіў у рэдакцыю 08.06.2016 г.
Кантакты: ihar.pushkin.st@gmail.com
(Пушкін Ігар Аляксандравіч)

**Pushkin I.A. NONRELIGIOUS ACTIVITIES OF THE RELIGIOUS COMMUNITIES OF THE ETHNIC MINORITIES IN THE BSSR (the 1930s).**

*The following forms of nonreligious activities of the religious communities of the ethnic minorities in the BSSR have been investigated: missionary activity, charitable activity, family upbringing, conservation of moral principles, religious organization management, enlightenment and education. The reasons stimulating religious activities of the religious communities and certain believers in the 1930s have been defined.*

**Key words:** religious minorities, church, denominations, repressions.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова